

Янік, Яся і Ягорка ведалі, што заўтра — матуліна свята. Не дзень народзінаў, не імяніны, а такая цудоўная нядзеля, калі віншуюць усіх мам у цэлым свеце.

Трайняты вельмі яе чакалі. Ім ужо споўнілася пяць гадоў — а значыць, яны такія дарослыя, што могуць прыдумаць падарунак самі, без таты.

І гэта абавязкова будзе сюрпрыз!

— Што б ты хацела на Дзень маці? — запытаўся ў мамы тата.

— Ды я ўсё маю, і нават зашмат! — засмяялася мама. — Хіба што мару як след выспацца ды адпачыць... Таму можаце падарыць мне заўтра трохі спакою.





Трайняты краем вуха пачулі гэтую размову.
— Мама хоча спакой, — сказаў Янік.
— Мама хоча нейкі з-пакой, — паўтарыла Яся.
— Мама хоча нешта памерам-з-пакой! — удакладніў Ягорка.
Нішто сабе падарунак!
Дзе яго такі ўзяць? І што гэта можа быць?
— Слон, — сказаў Янік.
— Аўтобус, — вырашыла Яся.
— Тэатр! — усклікнуў Ягорка.





Вядома, тэатр! Яны акурат нядаўна хадзілі на дзіцячы спектакль. Як жа прыгожа там было! Чырвоная заслона да самай падлогі. Вялізная жырандоля, дзе шкельцаў — бы зорак у небе. А на сцэне — і дрэвы, і кветкі, і птушачкі ў клетках, і брамы з фантанамі, і прынцы з прынцэсамі... Во дзе сапраўднае свята!

— Зладзім для мамы спектакль, — натхніўся Янік.

— У нашым пакойчыку, — падхапіла Яся.

— А пакой — ён якраз памерам-з-пакой! — узрадаваўся Ягорка.